# СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, КАМСАМОЛ!

Михаил ПЛЯЦКОВСКИЙ

## Что такое комсомол!

Что такое Комсомол!
Это — юность Родины.
Что такое Комсомол!
Это — гордость Родины.
Это — чудо-города,
Что в тайге построены.
Это — трудные пути,
Что геройски пройдены.

Что такое Комсомол!
Это — домны жаркие.
Что такое Комсомол!
Это — годы яркие.
Это — звонких проводов
Кружевные линии.
Это — свет над Ангарой
И хлеба целинные!

Что такое Комсомол!
Это — воля твердая.
Что такое Комсомол!
Это — сердце гордое.
Это — совести глаза,
Будто небо синее.
Это — руки мастеров
Молодые, сильные!

Что такое Комсомол!
Это — память грозная.
Что такое Комсомол!
Это — племя звездное.
Это — дружная семья.
Это — песня ладная.
Это — слава наших дней,
Как мечта, крылатая!

У камсамольскіх арганізацыях факультэтаў і падраздзяленняў нашага універсітэта ідуць справаздачна-выбарныя сходы. Камсамольцы абмяркоўваюць вынікі 1977-78 навучальнага года, работы ў СБА і ССГА. На сходах трымаюць справаздачу штабы «Камсамольскіх пражэктараў», разглядаюцца пытанні грамадска-палітычнай практыкі, Ленінскага заліку, арганізацыі вучобы.

Справаздачна-выбарныя сходы ўжо прайшлі на філфаку, журфаку, хімфаку, гістфаку, біяфаку, ФПМ, геафаку, на факультэтах радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычным, у камсамольскіх арганізацыях супрацоўнікаў АГЧ, ВЦ, НДІ ПФП, падрыхтоўчага факультэта, ІПК, сектара прыкладной сацыялогіі.

На высокім арганізацыйным узроўні прайшоў справаздачна-выбарны сход камсамольскай арганізацыі гістфака. Са справаздачным дакладам на ім выступіў сакратар камітэта камсамола факультэта Віктар Міхальчук. У сваім дакладзе ён, у прыватнасці, адзначыў, што камсамолія гістфака дасягнула нядрэнных вынікаў у вучобе, арганізавана і на дастаткова высокім узроўні прайшлі Ленінскі залік, грамадска-палітычная практыка. Добра наладжана на факультэце шэфская работа. Байцы СБА «Кастрычнік» з'явіліся ініцыятарамі правядзення аперацыі «Памяць».

На сходзе выступілі: П. Аксючыц — камандзір СБА імя Нікольскага; начальнік штаба працоўных спраў зачытаў рапарт аб рабоце будатрадаў факультэта; аб інтэррабоце на факультэце расказаў член камітэта камсамола П. Царашковіч.

Выступілі таксама А. Гарбацкі — старшыня студсавета інтэрната № 1, намеснік дэкана А. Г. Кляцкоў, намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ В. Левашэвіч.

Удзельнікі сходу ўсклалі кветкі да помніка У. І. Леніну і да памятнага Знака выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На высокім арганізацыйным узроўні прайшлі сходы і ў іншых камсамольскіх арганізацыях універсітэта.

**НА ЗДЫМКАХ: справаздачна-выбарны сход камсамольскай арганізацыі гістарычнага факультэта.**

**Фота М. ДУБОВІКА.**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (1218) ● 26 кастрычніка 1978 г. Цана 2 кап.

## Этапы вялікага шляху

**1917 г., ліпень — жнівень.** VI з'езд РСДРП (бальшавікоў). З'езд абмеркаваў пытанне аб рабоце партыі сярод моладзі і прыняў рэзалюцыю «Аб саюзах моладзі», якая вызначыла характар і шляхі развіцця камуністычнага юнацкага руху ў Расіі.

**1918 г., 29 кастрычніка — 4 лістапада.** І Усерасійскі з'езд саюзаў рабочай і сялянскай моладзі. З'езд стварыў Расійскі Камуністычны Саюз Моладзі.

**1918 г., лістапад.** Дэлегацыя І з'езда РКСМ — члены яго прэзідыума — наведала У. І. Леніна і мела з ім гутарку аб задачах камсамола.

**1919 г., красавік.** У Маскве адбыўся І Усерасійскі з'езд Саюза навучэнцаў-камуністаў, які прыняў рашэнне аб уваходжанні Саюза ў састаў РКСМ. На з'ездзе выступіў У. І. Ленін.

**1919 г., 10 мая.** На Маскоўска-Казанскай чыгунцы адбыўся першы камуністычны суботнік з удзелам камсамольцаў.

**1919 г., 20—26 лістапада.** У Берліне нелегальна праходзіў Устаноўчы юнацкі кангрэс, на якім быў заснаваны Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі.

**1920 г., верасень.** Першы Усебеларускі з'езд камсамольскіх арганізацый. Заснаваны Камуністычны саюз моладзі Беларусі.

**1924 г., студзень.** Пачаўся ленінскі заклік у рады камсамола. Уступіла больш як 150 тысяч юнакоў і дзяўчат.

**1926 г., 11—22 сакавіка.** VII з'езд камсамола. Камсамол стаў называцца ВЛКСМ.

**1928 г., 23 лютага.** У дзесятую гадавіну Чырвонай Арміі камсамол, у азнаменаванне яго баявых заслуг у перыяд замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны, узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга.

**1929 г., студзень — кастрычнік.** Камсамол правёў першы масавы паход за ўраджай і калектывізацыю. У час паходу было створана 5 тысяч новых калгасаў.

**1931 г., 21 студзеня.** Камсамол узнагароджан другім ордэнам — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — за праяўленую ініцыятыву ў справе ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва.

**1941—1945 гг.** У гады Вялікай Айчыннай вайны камсамольцы, уся савецкая моладзь прымалі самы актыўны ўдзел у абароне сацыялістычнай Радзімы: гераічна змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах, беззапаветна працавалі ў тыле. Яны праявілі вялікую мужнасць і стойкасць, паказалі непахісную адданасць Савецкай Айчыне.

**1945 г., ліпень.** За вялікія заслугі перад Радзімай у гады Вялікай Айчыннай вайны і за шырокую работу па выхаванню ў савецкай моладзі беззапаветнай адданасці сацыялістычнай Бацькаўшчыне ВЛКСМ узнагароджан трэцім ордэнам — ордэнам Леніна.

**1948 г., 29 кастрычніка.** За вялікія заслугі перад Радзімай у справе камуністычнага выхавання савецкай моладзі і актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве камсамол, у сувязі з яго 30-годдзем, узнагароджан чацвёртым ордэнам — ордэнам Леніна.

**1945—1955 гг.** У раёны асваення цалінных зямель выехалі 350 тысяч маладых патрыётаў.

**1956 г., 5 лістапада.** Улічваючы вялікія заслугі камсамольцаў і савецкай моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве і асабліва адзначаючы самаадданую і плённую працу камсамольцаў, савецкіх юнакоў і дзяўчат у паспяховым асваенні цалінных і залежных зямель, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў камсамол пятым ордэнам — ордэнам Леніна.

**1957 г., ліпень — жнівень.** У Маскве адбыўся VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. У ім удзельнічала звыш 30 тысяч юнакоў і дзяўчат з 131 краіны свету.

**1968 г., кастрычнік.** У сувязі з 50-годдзем і за вялікія поспехі па камуністычнаму выхаванню моладзі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў камсамол шостым ордэнам — ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі.





# КОММУНИЗМ—ЭТО МОЛОДОСТЬ М

Слова былому сакратару

## ...І свята майго пакалення

60-годдзе ВЛКСМ — вялікае свята не толькі сучаснай моладзі. Гэта свята тых, каго выхаваў і загартаваў камсамол. Я ганаруся тым, што амаль усё маё камсамольскае жыццё звязана з дзейнасцю камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна. Тут я набыў першыя навыкі грамадскай работы, атрымаў працоўную загартоўку. У пачатку 60-х гадоў мне пашчасціла на працягу амаль трох гадоў працаваць сакратаром камітэта камсамола універсітэта.

Гэта быў час, калі па ўсёй краіне здзяйснялася перабудова дзейнасці вышэйшай школы. У пачатку 60-х гадоў у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў асаблівая ўвага была нададзена пераадольванню існуючага адрыву навучання ад вытворчасці. У святле новых патрабаванняў ва універсітэце перабудоўваўся вучэбны працэс, уводзіліся новыя вучэбныя планы і праграмы, па-новаму стала праводзіцца практычнае навучанне студэнтаў, грамадска карысная праца пачынала адыгрываць усё большую ролю ў станаўленні маладых спецыялістаў.

Работа універсітэта ў новых умовах паставіла шэраг складаных задач і перад камсамольскай арганізацыяй. Пытанні барацьбы за павышэнне паспяховасці студэнтаў набылі асаблівую вастрыню. Абумоўлена гэта было тым, што па існаваўшых правілах прыёму на вучобу ва універсітэт тады прымалася 80 працэнтаў моладзі, якая мела стаж практычнай работы не менш 2 гадоў, і толькі 20 працэнтаў—выпускнікоў школ. Нярэдка для работнікаў вытворчасці конкурсы былі невялікімі, таму на вучобу залічваліся і тыя з іх, якія не мелі дастатковай падрыхтоўкі для працягу вучобы. Гэта адмоўна адбівалася на паспяховасці студэнтаў.

Камсамольскія арганізацыі выступілі ініцыятарам правядзення дадатковых заняткаў, кансультацый, штодзённа здзяйсняўся кантроль за самастойнай работай студэнтаў.

Для таго, каб лепш падрыхтаваць будучых абітурыентаў да вучобы ва універсітэце, наша камсамольская арганізацыя выступіла ініцыятарам стварэння курсаў на грамадскіх пачатках для моладзі, якая працуе. Упершыню такія курсы былі створаны ў 1960 годзе на Мінскім аўтазаводзе, заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў будтрэсце № 5 г. Мінска. Да выкладчыцкай работы на курсах было прыцягнута 120 студэнтаў і аспірантаў, якія дапамаглі падрыхтавацца да паступлення ў ВНУ 460 рабочым. Многія студэнты аказвалі індывідуальную дапамогу ў вучобе рабочай моладзі. Пачын нашай камсамольскай арганізацыі адобрыў Мінскі ГК КПБ.

Характэрным для пачатку 60-х гадоў было тое, што студэнты сталі значна больш прыцягвацца да грамадска карыснай працы. Некаторыя лічаць, што будаўнічыя атрады са студэнтаў беларускіх ВНУ пачалі стварацца з лета 1963 года. У БДУ ўжо летам 1960 года былі арганізаваны будаўнічыя студэнцкія атрады, якія працавалі на ўзвядзенні 1-й чаргі Салігорскага калійнага камбіната, нафтаправода Дашава — Мінск, галоўнага корпуса універсітэта і інтэрната на Паркавай магістралі. Вялікую дапамогу студэнты аказвалі калгасам у правядзенні сельгасработ.

Цікава ў той час вялася шэфская работа. Камсамольскія арганізацыі факультэтаў, курсаў і груп падтрымлівалі таксама сувязі з рабочай, калгаснай і вучнёўскай моладдзю Мінскай вобласці. Нашы студэнты чыталі шмат лекцый, выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, праводзілі мерапрыемствы са школьнікамі. Мы часта абменьваліся дэлегацыямі з маракамі Балтыйскага флоту, з ВНУ братніх рэспублік. Далейшае развіццё атрымалі тады інтэрнацыянальныя сувязі. Асабліва садзейнічала гэтаму тое, што з 1961 года ў нашым універсітэце пачыналася падрыхтоўка спецыялістаў для замежных краін.

Прыемна ўсведамляць, што ўсё лепшае ў дзейнасці камсамольскай арганізацыі мінулых гадоў і цяпер знаходзіцца на ўзбраенні камсамоліі БДУ.

**Р. МАЛЮКОВІЧ,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

## Веды—лепшая адзнака

У 1971 годзе наш універсітэт адсвяткаваў свой 50-гадовы юбілей. Пачаўся новы якасны этап у яго развіцці, які вызначаўся новымі важнымі задачамі развіцця народнай гаспадаркі краіны, а таксама больш высокімі патрабаваннямі да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Камсамольская арганізацыя універсітэта ў сувязі з гэтым выставіла канкрэтны лозунг барацьбы з пасрэднасцю ў вучобе, небяспадстаўна лічачы, што «пасрэдны студэнт ва універсітэце — пасрэдны працаўнік на вытворчасці».

Зыходзячы з гэтага, асаблівую ўвагу камсамольскія арганізацыі факультэтаў удзялялі акадэмічнай паспяховасці. Гэта выражалася не толькі ў тым, што пытанні паспяховасці і вучэбнай дысцыпліны студэнтаў былі пад пільным наглядам усіх звенняў камсамольскага дзеяння, пачынаючы ад вучэбнай групы. Ставілася таксама задача аказання канкрэтнай дапамогі адстаючым у вучобе, дзеля чаго выкарыстоўваліся самыя разнастайныя формы і метады ўплыву — ад індывідуальнага шэфства выдатнікаў да стварэння так званых кабінетаў спецыяльнай літаратуры ў інтэрнатах.

Камітэт камсамола універсітэта лічыў, што большасць нявыкарыстаных магчымасцей у стварэнні моцнага фундамента высокай паспяховасці канцэнтруецца на першым курсе, дзе абавязкова неабходна дапамагаць студэнту, «навучыцца вучыцца». Гэта разумелася камсамольскімі актывістамі ў шырокім сэнсе. Патрэбна было не толькі навучыць першакурснікаў канспектаваць лекцыі або авалодаць інструментам інфарматыкі, неабходна было раскрыць перад студэнтамі магчымасці універсітэта на шляху дасягнення вяршынь майстэрства ў сваёй спецыяльнасці, сфарміраваць такі псіхалагічны настрой, які б дазволіў кожнаму студэнту ўсвядоміць свае сілы ў пераадоленні цяжкасцей вучобы. Камсамольскія арганізацыі груп і курсаў імкнуліся хутка пазнаёміць першакурснікаў з універсітэтам, уцягнуць іх у кола грамадскіх спраў, з навічкоў зрабіць паўнапраўных гаспадароў студэнцкага жыцця. На гістарычным, фізічным, факультэце журналістыкі і прыкладной матэматыкі камсамольскія арганізацыі дасягнулі ў гэтым значных поспехаў.

Гэта канкрэтная праца універсітэцкай камсамольскай арганізацыі была адной з яе ганаровых і шматлікіх заслуг за 50 год існавання. У пачатку 1972 года ва універсітэце шырока адзначаўся паўвекавы юбілей першай камсамольскай арганізацыі вышэйшай навучальнай установы рэспублікі. З гэтай нагоды ЦК ЛКСМБ узнагародзіў яе Ганаровым сцягам.

**А. Слука,**
**в. а. дацэнта кафедры гісторыі журналістыкі.**


аб'явы

**27 кастрычніка ў 10 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца партыйная канферэнцыя.**

**Рэгістрацыя дэлегатаў пачнецца з 9 гадзін.**

**ПАРТКОМ.**


## Ідзём дарогай Кастрычніка

Напярэдадні 60-годдзя ВЛКСМ у камсамольскіх арганізацыях акадэмічных груп прайшоў Усесаюзны камсамольскі сход «Запаветам Леніна верныя».

У рабоце сходу актыўны ўдзел прынялі ўсе камсамольцы БДУ. На сходах прысутнічалі дэлегаты з'ездаў партыі і камсамола, прадстаўнікі падшэфных арганізацый, вядомыя вучоныя, лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола.

Так, на факультэт прыкладной матэматыкі да ўдзельнікаў сходу прыйшоў супрацоўнік універсітэта Л. Семяненка, які ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» за актыўны ўдзел у будатрадаўскім студэнцкім руху. Ён падзяліўся ўспамінамі аб сваёй камсамольскай рабоце, заклікаў студэнтаў умацоўваць і працягваць лепшыя традыцыі ВЛКСМ.

Перад студэнтамі гістарычнага факультэта выступіў Д. Б. Мельцар, доктар гістарычных навук. У 1943—1945 гадах ён быў сакратаром камітэта камсамола БДУ. Яго расказ аб рабоце камсамоліі універсітэта ў цяжкія ваенныя гады быў з асаблівай цікавасцю сустрэты слухачамі.



Пісьмо ў нумар

## Баявы, інтэрнацыянальн

Павел Карчагін, Зоя Касмадзям'янская служаць прыкладам не толькі для савецкай моладзі. Яны жывуць таксама і ў сэрцах маладых в'етнамцаў, якім са зброяй у руках давялося адстойваць незалежнасць сваёй радзімы. І зараз, калі здзейснілася гістарычная перамога, моладзь краіны Вялікага Кастрычніка застаецца для нас прыкладам. Распачатая ёю гіганцкая па свайму размаху будоўля веку — БАМ натхняе моладзь В'етнама пераадольваць цяжкасці і перашкоды ў будаўніцтве сацыялізму.

З пачуццём вялікай удзячнасці мы чыталі аб савецкіх маладых спецыялістах ва В'етнаме ў матэрыяле «Наш Тхайбінь», надрукаваным у «Комсомольской правде». Нам асабліва прыемна, што многія мясціны далёкага В'етнама сталі дарагімі і блізкімі ім. Такімі ж блізкімі для нас, в'етнамскіх студэнтаў, сталі універсітэт, дзе цяпер вучымся, а таксама горад, у якім жывём. Цесныя сяброўскія сувязі звязваюць зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў з камітэтамі камсамола БДУ, Мінскага ордэна Леніна камвольнага камбіната імя 50-годдзя Кампартыі Беларусі. Сумесныя вечары дружбы з савецкай моладдзю, гутаркі — вядома, няпоўны пералік тых сувязей, якія ўмацоўваюць наша сяброўст-

# ...ИРА,

На высокім узроўні прайшоў сход і на механіка-матэматычным факультэце. Тут перад камсамольцамі выступіў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік у адстаўцы А. С. Мізрахі.

## Яны падпісалі Рапарт

Год працягвалася сацыялістычнае спаборніцтва паміж студэнтамі БДУ за права падпісаць Рапарт камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна ЦК ВЛКСМ у гонар 60-годдзя Ленінскага камсамола. І вось выяўлены пераможцы, лепшыя з лепшых. Іх 516, актыўных камсамольцаў, выдатнікаў вучобы, дэлегатаў камсамольскіх з'ездаў. Сярод іх дэлегатка XVIII з'езда ВЛКСМ, студэнтка V курса геафака Т. Свіціна, дэлегатка XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, студэнтка V курса юрфака Т. Аўдацейка, сакратар камсамольскай арганізацыі ФПМ В. Гарус, які быў сфатаграфаваны на крэйсеры «Аўрора», ленінскі стыпендыят, студэнтка біяфака А. Прасвірніна і іншыя.

**І. САВЕТКІНА.**

**(Тэкст Рапарта чытайце на 4-й стар.)**



# У АДЗІНЫМ ПАРЫВЕ

**Тамара АЎДАЦЕЙКА,**
**студэнтка V курса юрфака,**
**дэлегат XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.**

Ёсць старая руская прыкмета: прыязджаць у дождж — добры знак. Не ведаю, ці існуе такая прыкмета на Кубе, але ў дзень адкрыцця фестывалю на Гавану абрушыўся лівень. Мы прамоклі літаральна ў некалькі секунд. Пад бубен дажджу над Лацінаамерыканскім стадыёнам Гаваны грымелі апладысменты, гучалі лозунгі аб міры, дружбе. Яшчэ не скончыў сваёй палымянай віншавальнай прамовы таварыш Рауль Кастра, а вестка аб пачатку дзейнасці форуму абляцела розныя куткі зямнога шара.

У рабоце фестывалю прыняло ўдзел 18,5 тысячы юнакоў і дзяўчат, пасланцоў 145 краін свету. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што фестываль з'явіўся знамянальным этапам ва ўмацаванні адзінства ўсіх антыімперыялістычных сіл. За 9 дзён работы адбылося 1 209 мерапрыемстваў, кожнае з якіх надоўга застанецца ў нашай памяці. Усе яны забяспечвалі нам пастаянныя зносіны з моладдзю розных краін: былі гэта сустрэчы на мітынгах салідарнасці з народамі, якія змагаюцца за незалежнасць, ці ў клубе савецкай дэлегацыі альбо на цеплаходзе «Грузія», сустрэчы на шматлікіх канцэртах ці проста на вуліцах святочнай Гаваны. На ўсіх іх завязвалася гутарка на мове, зразумелай усёй моладзі — мове дружбы. Нас цікавіла, як жывуць людзі іншых краін, якія справы і клопаты ў іх моладзі. На розных мітынгах, прыёмах усе дэлегацыі шукалі сустрэч з намі. Нам гэта было прыемна, і мы, у сваю чаргу, імкнуліся зрабіць так, каб у іх засталося самае добрае ўражанне аб савецкіх грамадзянах. Амаль ніводная з сустрэч не абыходзілася без музыкі, песень. Сваё мастацтва тут дэманстравалі ансамблі і салісты з розных краін. Нярэдка да іх выступленняў далучаліся і самі гледачы.

Кожны дзень на цеплаходзе «Грузія» працаваў інтэрнацыянальны клуб, які наведалі практычна ўсе дэлегаты. У клубе дэманстраваўся дакументальны фільм «Галоўная плошча», які расказвае аб гісторыі нашай краіны. У працэсе дэманстрацыі фільма, калі на экране быў У. І. Ленін, з'яўляліся кадры, якія расказвалі аб першых камуністычных суботніках, Чырвонай плошчы ў дні святочных дэманстрацый працоўных, ён неаднаразова перапыняўся апладысментамі гасцей.

Асноўнай праблемай форуму стаў клопат моладзі аб будучым, рашучасць адстаяць мір на зямлі. Пра салідарнасць моладзі, пра адзінства яе ідэй гаворыць хаця б такі факт. На стадыёне праходзіла шэсце прадстаўнікоў кожнай дэлегацыі. Патрэбна было бачыць, як у адзіным парыве ўстаў стадыён, калі дыктар аб'явіў: «Чылі» і з партрэтам Сальвадора Альендэ прайшла група маладых чылійскіх патрыётаў. А калі на стадыён выйшла дэлегацыя Савецкага Саюза, увесь стадыён патануў у апладысментах, пранеслася гучнае «Ура!».

Фестывальная праграма была вельмі насычанай. Я расказала самую драбніцу таго, што адбывалася ў дні форуму на Кубе.

*Лепшая пярвічная*

# Калі ёсць агульная зацікаўленасць

У гэтыя дні на камсамольскую паверку становяцца лепшыя з лепшых: дэлегаты XVIII з'езда ВЛКСМ, удзельнікі XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва за ганаровае права падпісаць **Рапарт ЦК ВЛКСМ да** 60-годдзя ВЛКСМ.

Камсамольская арганізацыя філалагічнага факультэта, як і ўся камсамолія краіны, рыхтавалася дастойна сустрэць юбілей.

Галоўная праца студэнта — вучоба, вучоба напружаная, творчая, захапляючая, накіраваная на падрыхтоўку да будучай работы. Прыкметна тое, што ў гэты час на факультэце іменна якасць вучобы, адносіны да яе становяцца аб'ектам увагі і клопату саміх акадэмічных груп. Карпатлівая работа факультэцкага акадэмсавета адбілася на сесіі, вынікі якой сведчаць аб тым, што паспяховасць студэнтаў філалагічнага факультэта павысілася ў параўнанні з мінулым годам. Павялічылася колькасць выдатнікаў, больш стала студэнтаў, якія здалі сесію на «добра» і «выдатна».

XXV з'езд КПСС назваў 10-ю пяцігодку пяцігодкай эфектыўнасці і якасці. І, зыходзячы з гэтага, мы маем права сёння больш прынцыпова, крытычна падыходзіць і да троечнікаў. Троечнік у ВНУ — гэта пасрэдны спецыяліст у школе. Час дыктуе свае ўмовы, ён не чакае. І, відаць, не выпадкова набыў цяпер новы якасны змест дэвіз «Ніводнага адстаючага побач!» Камітэт камсамола падтрымлівае тыя групы, дзе ўжо сёння гэты дэвіз стаў нормай ацэнкі работы і вучобы кожнага камсамольца. Гэта 2-я група V курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры (камсорг — Грыцко), 2-я група II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры (камсорг Т. Кавалеўская) і іншыя.

Вялікую цікавасць праяўляюць камсамольцы да навуковай работы. Зараз рознымі формамі навуковай работы ахоплены ўсе студэнты факультэта. На чарговы рэспубліканскі агляд-конкурс студэнцкіх навуковых работ факультэт прадставіў 64 работы.

Наша будучая прафесія, прафесія педагога, выхавацеля, прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да ідэйна-палітычнай вучобы студэнтаў, да ўсёй сістэмы камуністычнага выхавання ў ВНУ. У гэтым плане вялікую дапамогу аказвае ГПП студэнтаў у рамках Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!»

Грамадска-палітычная атэстацыя студэнтаў на факультэце прайшла на высокім узроўні. Атэставана 1 043 студэнты, 823 чалавекі атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі.

Адной з форм работы камітэта камсамола была арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва паміж курсамі. Такое спаборніцтва дало магчымасць павысіць актыўнасць камсамольцаў, іх адказнасць за даручаную справу. Лепшым курсам па арганізацыі камсамольскай работы прызнаны III курс аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры (сакратар Э. Гінько), на другім месцы V курс таго ж аддзялення (сакратар Л. Ваўчок), на трэцім — IV курс аддзялення рускай мовы і літаратуры (сакратар Т. Сотчанка). Камсамольцы вырашылі стварыць на факультэце кнігу камсамольскай славы, куды заносіліся б імёны пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, камсамольскіх актывістаў, лепшыя камсамольскія арганізацыі груп і курсаў.

Камсамольцы нашага факультэта шэфствуюць над дзвюма сельскімі і дзвюма гарадскімі школамі, у двух домакіраўніцтвах і рэдкалегіях 42-х школ г. Мінска.

Шмат зроблена студэнтамі — членамі клуба «Сэрца аддаю дзецям». Гэта шматлікія лекцыі, ранішнікі, піянерскія зборы, гутаркі, сустрэчы.

Многае робіцца па прапагандзе сістэмы вышэйшай школы, па прафарыентацыі. Аднавіўшы старую традыцыю, камітэт камсамола правёў Дзень адчыненых дзвярэй.

Уся работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў вялася пад знакам дастойнай сустрэчы 60-годдзя Узброеных Сіл СССР. Напярэдадні гэтага свята былі аформлены шматлікія стэнды, арганізаван крос-прабег «Мінскае мора — Масюкоўшчына» з мітынгам на месцы былога канцлагера, праводзіліся паездкі ў Хатынь і на Курган Славы, экскурсіі ў музеі Мінска, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Добрай традыцыяй стала правядзенне «Урока мужнасці» для першакурснікаў.

На нашым факультэце надаецца вялікая ўвага маральна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў. Сектар ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання назапасіў вялікі вопыт работы ў гэтым напрамку.

На працягу года было праведзена 9 сустрэч з дзеячамі навукі і мастацтва, прачытана 13 лекцый на тэмы маральна-эстэтычнага выхавання.

На факультэце працуюць харавы і танцавальны калектывы, вакальна-інструментальны ансамбль, тэатр мініяцюр.

Лета 1978 года знамянальна тым, што ў Гаване адбыўся XI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Да гэтага свята рыхтаваліся ўсе студэнты факультэта. Прайшлі шматлікія інтэрнацыянальныя вечары пад дэвізам «Ад фестывалю да фестывалю», адбыліся сустрэчы, гутаркі.

Вялікі ўплыў на развіццё грамадскай актыўнасці аказваюць студэнцкія будаўнічыя атрады— школа працоўнага выхавання моладзі.

На факультэце сфарміраваны 4 студэнцкія атрады: інтэратрад імя Ф. Шменкеля, СБА «Мара», якія працавалі ў Малдавіі. На меліярацыі працаваў СБА «Буравеснік» імя В. І. Казлова, атрад праваднікоў «Верасок».

Работа з камсамольскім актывам займае важнае месца ў жыцці камітэта камсамола філфака. Школа камсамольскага актыву на факультэце — гэта наш гонар.

Мы добра папрацавалі ў мінулым навучальным годзе, і як вынік — першае месца па арганізацыі камсамольскай работы. Гэта ганаровае месца да многага абавязвае нас.

**Ж. РЫМКЕВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.**

# ...ы камсамол

...ва. У паўсядзённым жыцці мы бачым лепшыя рысы савецкага маладога пакалення. Яму ўласцівы высокі ўзровень класавай свядомасці, лепшыя інтэрнацыяналістычныя традыцыі, выхаваныя сацыялізмам.

З вялікай увагай мы сочым за актыўным удзелам Ленінскага камсамола, савецкай моладзі ў акцыі салідарнасці «Савецкая моладзь — юнаму пакаленню В'етнама», за міжнароднымі сустрэчамі моладзі па праблемах міру і раззбраення. Савецкая моладзь па праву лічыцца ядром адзінага антыімперыялістычнага фронту моладзі планеты.

Мы віншуем цябе са святам, баявы, інтэрнацыянальны камсамол!

**Ле Туан Хоа,**
**Фам Ву Тхінь,**
**Та Хонг Куанг,**
**То Туан,**
**студэнты універсітэта.**

# И ЕГО ВОЗВОДИТЬ МОЛОДЫМ!

# РАПАРТ

**КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫ БДУ імя У. І. ЛЕНІНА ЦК УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ ДА 60-ГОДДЗЯ ВЛКСМ.**

*Быць членамі Саюза моладзі, значыць весці справу так, каб аддаваць сваю работу, свае сілы на агульную справу.*
**У. І. Ленін.**

Напярэдадні знамянальнай даты ў гісторыі нашай Радзімы — 60-годдзя Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі — мы рапартуем Цэнтральнаму Камітэту ВЛКСМ, што камсамольская арганізацыя Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, якая налічвае ў сваіх радах больш як адзінаццаць тысяч членаў ВЛКСМ, устаўшы на юбілейную камсамольскую вахту, дабілася новых поспехаў у павышэнні працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, выхаванні ў будучых спецыялістаў камуністычнай перакананасці, свядомай дысцыпліны, любві да сваёй прафесіі.

Для нас, камсамольцаў універсітэта, які носіць імя вялікага Леніна, няма нічога больш узвышанага і высакароднага, чым быць вернымі запаветам геніяльнага правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі, самаахвярна змагацца за справу, якой ён прысвяціў усё сваё жыццё. Кожны з нас лічыць сваім абавязкам не толькі добра і выдатна вучыцца, але і актыўна дапамагаць партыйнай арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў навучанні і выхаванні высокакваліфікаваных, палітычна адукаваных спецыялістаў.

Усе свае намаганні мы накіроўваем на тое, каб выдатнай вучобай, творчай працай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці ўнесці свой уклад у выкананне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, XVIII з'езда ВЛКСМ.

У цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі пастаянна знаходзіцца вучоба кожнага студэнта. Усе студэнцкія групы разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам: «Ніводнага адстаючага побач!» Сёння мы рады паведаміць Цэнтральнаму Камітэту, што ў ходзе спаборніцтва якасная паспяховасць студэнтаў павысілася на 3,4 працэнта. Па выніках 1977-78 навучальнага года больш як 400 студэнтаў узнагароджаны значкамі ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу». А ўсяго ва універсітэце 1 284 выдатнікі вучобы, 18 імянных стыпендыятаў, 4 012 камсамольцаў займаюцца на «добра» і «выдатна».

З кожным годам шырыцца гарызонт студэнцкай навукі. У навукова-даследчай рабоце ўдзельнічаюць больш як 7 тысяч студэнтаў, з якіх 1 660 чалавек займаюцца распрацоўкай гасдагаворных тэм.

У сучасных умовах важным сродкам камуністычнага выхавання з'яўляюцца Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!», грамадска-палітычная практыка. 99,7 працэнта усіх студэнтаў нашай ВНУ атэставаны па выніках ГПП у 1978 годзе. Зараз кожны камсамолец працуе над выкананнем асабістага комплекснага плана «Вучымся камунізму — будуем камунізм!».

Вялізную ўвагу мы надаём выхаванню моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа. Маршрутамі славы прайшлі 24 «зорныя» атрады універсітэта. Больш як 200 імён выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены пошукавай групай «Доўг».

Шырокі размах набыла шэфская работа нашых студэнтаў у школах і домакіраўніцтвах. Звыш 2 тысяч камсамольцаў універсітэта шэфствуюць над 12 сельскімі і гарадскімі школамі, 13 дзіцячымі і піянерскімі пакоямі пры домакіраўніцтвах, у прафтэхвучылішчах г. Мінска.

У Белдзяржуніверсітэце працуюць амаль 1400 маладых вучоных і спецыялістаў. Толькі ў мінулым годзе імі пададзена 25 рацпрапаноў і вынаходстваў, апублікавана 986 манаграфій і навуковых артыкулаў, 11 чалавек сталі лаўрэатамі рэспубліканскага тура V Усесаюзнага конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках. Вялікую работу праводзяць маладыя вучоныя па развіццю тэхнічнай творчасці навучэнцаў. Зараз яны кіруюць 52 тэхнічнымі гурткамі ў гарадскіх і сельскіх школах Мінска і вобласці, арганізавалі для школьнікаў 6 прадметных алімпіяд, правялі больш як 840 гутарак і лекцый па прафарыентацыі.

Наша партыя і урад прадастаўляюць нам магчымасць не толькі авалодваць ведамі ў аўдыторыях, але і актыўна ўдзельнічаць у камуністычным будаўніцтве. Таму, як ганаровы абавязак, мы разглядаем свой удзел у трэціх працоўных семестрах. Ударнай працай азнаменавалі будатрадаўцы універсітэта юбілейны год камсамола. 2 100 студэнтаў на будоўлях Беларусі, БАМа, Нечарназем'я, Малдавіі, Карэліі, Кіргізіі, Комі АССР асвоілі амаль 5,5 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Рукамі байцоў узведзена 23 жылыя дамы, 20 жывёлагадоўчых памяшканняў, 25 школ і іншых аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння. Студэнты-будаўнікі БДУ прачыталі 1 243 лекцыі, агітбрыгадамі дадзена 629 канцэртаў, 4 393 кнігі перададзена сельскім і школьным бібліятэкам.

Па ініцыятыве СБА «Кастрычнік» у камсамольскіх арганізацыях рэспублікі разгарнулася аперацыя «Памяць», мэтай якой з'яўляецца збор і запіс успамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, напісанне кнігі-летапісу народнага подзвігу. Гэта ініцыятыва была падтрымана усімі атрадамі Беларусі і адобрана ЦК ЛКСМБ.

У гэтым годзе ва універсітэце быў сфарміраваны камуністычны атрад імя А. Матросава. Разам са сваімі равеснікамі з Пскоўскіх ВНУ байцы атрада ўзвялі велічны комплекс-абеліск ля вёскі Чарнушкі, на месцы гераічнага подзвігу воіна-камсамольца Аляксандра Матросава. Гэта — наша памяць і даніна мужнасці герояў камсамола.

З пачуццём бязмежнага гонару за нашу сацыялістычную рэчаіснасць, вялікую партыю камуністаў-ленінцаў успрынялі камсамольцы універсітэта дакументы ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС, парады. указанні і заўвагі Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева, якія ён даў у час знаходжання ў Мінску.

У адказ на бацькоўскі клопат партыі і народа запэўніваем Цэнтральны Камітэт Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, што прыкладзём усе намаганні для паспяховага выканання рашэнняў XXV з'езда КПСС і XVIII з'езда ВЛКСМ, выдатнай вучобай, высокай грамадска-палітычнай актыўнасцю азнамянуем кожны дзень дзесятай пяцігодкі, унясём дастойны уклад у пабудову камуністычнай будучыні.



# Бамаўскае лета «Кастрычніка»

«Як-40» рэзка набіраў вышыню, павярнуўшыся на поўнач, да Якуцка. У салоне было ціха. Усе прыпалі да ілюмінатараў. Моўчкі развітваліся з асветленымі сонцам сопкамі, з бясконцай тайгой, з пасёлкам Сярэбраны Бор, які застаўся недзе за гарызонтам. Перагорнута яшчэ адна старонка біяграфіі зводнага універсітэцкага студэнцкага будатрада «Кастрычнік». Старонка самая памятная і важкая — бамаўская.

Аб БАМе цяжка расказваць. Яго трэба бачыць. Магутную тэхніку, якая будзіць цішыню тайгі і векавых балот. Шчаслівыя, а часам стомлена - сканцэнтраваныя твары будаўнікоў магістралі. Эмблемы Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўлі, што гараць на іх спяцоўках.

Два месяцы працоўнага семестра... Мы разумеем, як мала гэта ў параўнанні з многамесячнай гераічнай вахтай тых, хто высаджваўся на месцы будучай трасы з першымі таёжнымі дэсантамі, хто абуджаў лясную маўклівасць трэскам бензапілы на першых бамаўскіх прасеках. Але як прыемна ўсведамляць, што ў рапарце, з якім ідуць да юбілею камсамола будаўнікі магістралі, будзе і радок, упісаны рукамі байцоў нашага «Кастрычніка»!

За два месяцы атрадам асвоена 415 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. За гэтай лічбай — дзве падрыхтаваныя да эксплуатацыі аўтастаянкі, сотні кубаметраў укладзенай у апоры цеплатрасы і фундамент пускаацяпляльнай кацельні бетону.

Сакрэт вытворчых поспехаў «Кастрычніка» — у мэтанакіраванасці камандзіра атрада Віктара Міхальчука, у запале камісара Генадзя Храпко, ва ўмелым кіраўніцтве майстра Мікалая Сіліна, у вялікім будатрадаўскім вопыце ўсіх яго байцоў, набытым у час працоўных семестраў мінулых год на будоўлях Нечарназем'я, Беларусі, Казахстана, Сярэдняй Азіі.

Лічбавым адзнакам паддаецца не ўсё. Ёсць у актыве атрада і справы, зразумець і ацаніць якія можна толькі сэрцам. Аперацыя «Памяць», ініцыятарам якой стаў «Кастрычнік», стала галоўнай справай у грамадска-палітычнай рабоце атрада. Яе вынік — запісаныя ў альбомах і на магнітафоннай стужцы расказы людзей, у чыёй біяграфіі разам зліліся подзвігі ратныя — на палях бітваў Вялікай Айчыннай і працоўныя — на буйных будоўлях Сібіры.

Будпляцоўкі і чырвоныя куткі інтэрнатаў, новенькі сярэбранаборскі клуб былі своеасаблівым «фронтам работ» для нашых агітбрыгады і лектарскай групы. І на гэтым фронце байцы «Кастрычніка» папрацавалі на «выдатна»!

Пакідаючы палатачны гарадок у тайзе, кожны з нас аставіў у памяці нешта сваё, запаветнае і незабыўнае. Можа таму і маўчалі ў самалёце — кожны думаў аб сваім.

**С. НОВІКАЎ,**
**А. УЛІЦЁНАК,**
**студэнты факультэта журналістыкі.**

## *Моладзь міру — за мір!*



Да 60-годдзя БССР і КПБ

# ПРАЦУЕ ШКОЛА

Ідучы насустрач слаўнаму юбілею, камсамольская арганізацыя кафедры фізікі паўправаднікоў вядзе значную выхаваўчую і арганізацыйную работу. Адной з асноўных сваіх задач камсамольцы лічаць глыбокае вывучэнне гістарычнага вопыту партыі, прапаганду дасягненняў нашай рэспублікі. Не так даўно для камсамольцаў кафедры арганізавана школа будучага камуніста. Вялікую падтрымку ў яе стварэнні аказала партгрупа кафедры. Кіраўніком школы выбраны камуніст Т. Працько, абмеркавана на сходзе партгрупы праграма школы.

Слухачамі школы стаў камсамольскі актыў кафедры. Заняткі праводзяцца раз у месяц і плануюцца так: першая палова — лекцыя, другая — семінар. У праграме школы — актуальныя пытанні міжнароднага камуністычнага руху, гісторыі Кампартыі Беларусі, задачы камсамольцаў кафедры і г. д.

**А. ПРАНІШНІКАЎ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 1552. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ АТ 18047.